# НАВІНЫ

## СВЕТУ

Моцныя маразы ва Украіне сталі прычынай гібелі 40 чалавек, больш за 800 пацярпелі на працягу тыдня. Асноўнай прычынай гібелі людзей у Міністэрстве аховы здароўя назвалі замярзанне ў нецвярозым стане.

## КРАІНЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 12 студзеня падпісаў Дэкрэт № 1, што прадугледжвае ўнясенне змяненняў у Дэкрэт ад 2 красавіка 2015 года № 3 "Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства".

♦ ♦ ♦

Павелічэнне глыбіні перапрацоўкі малочнай сыроваткі і экспарт прадуктаў перапрацоўкі можа прынесці дадаткова $10-12 млн, лічыць старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч.

♦ ♦ ♦

Выкарыстанне патэнцыялу льняной галіны можа ўнесці істотны ўклад у эканоміку. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.

♦ ♦ ♦

Прадукцыя жывёльнага паходжання з Беларусі адпавядае ўсім патрабаванням ветэрынарна-санітарнага кантролю Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС).

♦ ♦ ♦

ААТ "Белаграпрамбанк" плануе вясной пачаць выдачу льготных крэдытаў на будаўніцтва жылля, паведаміў намеснік старшыні праўлення банка Віталь Крук.

♦ ♦ ♦

Тэрмін дзеяння Указа № 191 "Аб аказанні падтрымкі арганізацыям фізічнай культуры і спорту" прадоўжаны на новы алімпійскі цыкл — да 2020 года.

♦ ♦ ♦

Арганізацыі аховы здароўя будуць прадстаўляць у падатковыя органы інфармацыю аб часовай непрацаздольнасці грамадзян пры наяўнасці пісьмовай згоды апошніх.

♦ ♦ ♦

Сітуацыя па грыпе ў Беларусі спакойная, паведаміла намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна Карабан.

♦ ♦ ♦

У Беларусі 25,4 працэнта атрымальнікаў пенсій прадаўжаюць працаваць — кожны чацвёрты пенсіянер, паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларыса Яшкова.

♦ ♦ ♦

У Беларусі колькасць зарэгістраваных беспрацоўных зніжаецца дзевяць месяцаў запар — з 53,8 тыс. чалавек на 1 мая 2016 года да 35,3 тыс. на 1 студзеня 2017 года (гэта на 18,5 працэнта менш, чым на 1 студзеня 2016-га).

♦ ♦ ♦

Узровень злачыннасці ў Беларусі зменшыўся на 4,5 працэнта ў 2016 годзе ў параўнанні з 2015 годам. Пра гэта паведаміў старшыня Следчага камітэта Беларусі Іван Наскевіч.

♦ ♦ ♦

Па даных службы метэаралагічных прагназаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя, тэмпература паветра ў Беларусі пачне паніжацца ў пачатку наступнага тыдня.

## ВОБЛАСЦІ

Больш за 80 кг наркотыкаў і псіхатропаў канфіскавалі праваахоўнікі Віцебскай вобласці за 2016 год, паведаміў на прэс-канферэнцыі начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Віктар Сянько.

*Па паведамленнях БелТА*

---

■ МНЕНИЕ

# Фактор успеха

**«Успех моего бизнеса в руках людей, которых я нанимаю», — это высказывание президента компании Сони Акио Морита в полной мере можно отнести к деятельности Браславской РОС ДОСААФ, считает международный эксперт в области систем менеджмента Светлана Глазкова. Женщина с недавних пор живет на Браславщине, и так сложились обстоятельства, что подготовку к сдаче экзамена на водительские права она проходила в нашем городе, о чем нисколько не жалеет. Своим мнением насчет качества услуг, предоставляемых этой организацией, она поделилась с «Браславской звездой».**



Светлана Глазкова.

Сегодня очень много говорят о качестве продукции, услуг, процессов, удовлетворенности потребителей…

Мы все в той или иной степени являемся потребителями и желаем получить в установленные сроки, по доступной цене продукт (услугу) наивысшего качества и, конечно, иметь выбор, предъявляя при этом к организации жесткие требования. Не нужно быть аналитиком, чтобы знать — для эффективного функционирования любому предприятию необходимы ресурсы: человеческие, информационные, финансовые, а также инфраструктура. Вместе с тем микроклимат в коллективе тоже является важнейшим ресурсом и влияет на показатели успеха организации в целом.

Недавно мне довелось наблюдать работу коллектива Браславского РОС ДОСААФ и, более того, быть потребителем их услуг. Практически 4 месяца для меня здесь всё было как на ладошке. Надо отметить, что организация работает очень профессионально, часто не имея тех самых ресурсов, о которых говорилось выше. Но у них есть самое главное — коммуникабельность, отзывчивость и профессионализм. Преподаватели и мастера смогли создать атмосферу доброжелательности, создать группу единомышленников, сплотить нас в одну семью.

Наш преподаватель Елена Белюн — профессионал своего дела, строгая, безупречно красивая, справедливая и отдающая нам, ученикам, не только свои знания, опыт, но и частичку души. Теория ПДД, зачеты — всё строго и бескомпромиссно. И любая помощь при возникающих вопросах по изучаемому материалу — не считаясь со временем, ведь речь идет о безопасности на дороге, подготовке водителей, которые завтра будут управлять автомобилем.

Мастера автошколы обучают вождению, как говорится, «с нуля». Алексей Шпакович — специалист, готовый в любой момент прийти на помощь, безотказный, терпеливый, с «железными нервами», умеющий найти подход к каждому. А после обучения он по первому зову спешит на помощь и становится просто лучшим другом Лёшей.

Во время обучения стало понятно, что коллектив РОС ДОСААФ во главе с директором Войтехом Завацким дружный и слаженный, искренне переживающий за каждого ученика. Наверное, в этом и есть их фактор успеха. Я рада, что на моем пути встретились такие отзывчивые, дружелюбные и доброжелательные люди. Пусть им сопутствуют здоровье, удача, семейное счастье. Хочется пожелать всем организациям и предприятиям создать такой же микроклимат, как в их коллективе, ведь это критерий хорошего имиджа и успеха. ■

---

■ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

**Пачынаючы з 2010 года ў сельгаспрадпрыемствах вобласці зніжаюцца прыплоды маладняку буйной рагатай жывёлы. Не стаў выключэннем і наш раён. За мінулы год на 100 кароў было атрымана 67 цялят. Гэта хаця і больш на 6 галоў, чым годам раней, але і самы нізкі паказчык па Віцебскім рэгіёне.**



# ЯЛАВЫЯ КАРОВЫ МАЛАКА НЕ ДАДУЦЬ

Цяпер спецыялісты РУП "Віцебскае племпрадпрыемства" выязджаюць у раёны, дзе праводзяць з зоаветспецыялістамі і тэхнікамі-асемянатарамі навучальныя семінары па тэхналогіі пакрыцця жывёлы, павышэнні эфектыўнасці штучнага асемянення. На гэтым тыдні адбыўся такі ў нашай райветстанцыі.

На пачатку сустрэчы намеснік генеральнага дырэктара племпрадпрыемства Анатоль Шпыркін расказаў прысутным пра сітуацыю з прыплодамі, якая склалася ў вобласці. Каб выправіць яе, аблвыканкам па прапанове камітэта па сельскай гаспадарцы і прадуктах харчавання абвясціў 2017 год для сельгаспрадпрыемстваў годам узнаўлення. У рамках яго вызначаны цэлы комплекс мерапрыемстваў для павелічэння эфектыўнасці штучнага асемянення кароў і, як вынік, атрымання большага пагалоўя маладняку.

Аналізуючы стан спраў у нашым раёне, Анатоль Браніслававіч адзначыў, што калі ад агульнага паказчыка адняць вынікі "Маяка Браслаўскага" і "Агравідзаў" з іх выхадам цялят на 100 кароў у 92 і 83 галавы адпаведна, то сярэдні паказчык па астатніх гаспадарках не перавысіць і 50 галоў прыплоду. Гэта значыць, што палова дойнага статка застаецца ялавай. Ад ялавай жа каровы малака не надоіш. Найбольш складаная сітуацыя з ацёлам кароў у мінулым годзе склалася ў "Новай Гвардыі", "Мяжанах" і "Слабодцы-агра", дзе прыплод прынеслі толькі 34, 43 і 52 працэнты дарослай жывёлы.

Затым галоўны спецыяліст племпрадпрыемства Уладзімір Барысенка правёў заняткі па тэхналогіі асемянення, асновах лячэння гінекалагічных захворванняў, стымуляцыі жывёлы. Наступны навучальны семінар будзе арганізаваны для тэхнікаў-асемянатараў. ■

**Аляксандр АЗЕВІЧ.**

---

■ ЕСТЬ ПРОБЛЕМА

# НА ДЕЛИКАТНУЮ ТЕМУ

**От пассажиров, коротающих время в зале ожидания браславской автостанции перед отправлением автобусов, неоднократно доводилось слышать нарекания на неприятный запах, распространяющийся из коридора, по левой стороне которого находятся платные туалеты. И это несмотря на практически идеальную чистоту, которую тщательно поддерживают в здании автостанции на протяжении каждого рабочего дня 2 техработника.**

По словам главного механика АТП № 18 Славомира Яроцкого, отвечающего за организацию текущего ремонта зданий и сооружений автотранспортного предприятия, недостатка в чистящих и моющих средствах, ветоши для раздельной уборки санузлов и других помещений никогда не было. Тем не менее неприятный запах, особенно во время наплыва пассажиров, действительно периодически присутствовал в зале ожидания.

Поэтому, говорит С. Яроцкий, для его устранения в декабре был осуществлен ряд технических и организационных мероприятий. В частности, в санузлах прочищены вентиляционные каналы, оптом закуплен новейший дезинфицирующий состав, учащена периодичность влажной уборки.

Каждый цивилизованный человек, однако, прекрасно понимает, что надлежащая санитария зависит не только от благоприятных гигиенических условий и прилежности обслуживающего персонала, но и от культуры личностного поведения. Упоминаю это к тому, что техработникам автостанции порой чуть ли не за каждым вторым посетителем общественного туалета в буквальном смысле приходится бегать не только смывать унитаз, но и убирать остатки справленной нужды в не предназначенном для этого месте. Объяснить мотивы такого дикарского поведения в состоянии, пожалуй, только психологи. Всем же остальным, кто невольно страдает от подобного бескультурья, в принципе всё равно, каковы они. А вот результаты неадекватных поступков в общественном санитарно-гигиеническом месте уж точно как минимум портят настроение. ■

**Казимир ПЕТУШКО.**